УДК 82.09

# МАСТАЦКАЯ ТРАНСФАРМАЦЫЯ ПРАБЛЕМЫ ЧАЛАВЕЧАГА БЫЦЦЯ НА МАТЭРЫЯЛЕ БЕЛАРУСКАЙ «ВАЕННАЙ» АПОВЕСЦІ В. БЫКАВА І І. НАВУМЕНКІ

*Т.Р. БАГАРАДАВА*
*(Полацкі дзяржаўны універсітэт)*

*Аналізуецца трансфармацыя катэгорыі «быццё» ў дачыненні да проблем чалавека. Робіцца мастацкі аналіз дадзенага пытання, неабходны для асэнсавання беларускай «ваеннай» аповесці (на матэрыяле творчасці В. Быкова і 1. Навуменкі).*

Сусветная літаратура з антычнасці і да сучаснасці імкнулася прымусіць грамадства задумацца над праблемай быцця ў цэлым і чалавечага існавання ў прыватнасці, месца чалавека ў свеце.

Даследчык-германіст, культуролаг А. Міхайлаў сцвярджаў, што чалавек ёсць элемент цэлага: ён звязаны са светам-акружэннем, а таксама з небам і зямлёй. Свет жа з'яўляецца такой прасторай, у якой чалавек знаходзіць сваё сапраўднае месца і свой сэнс.

Сёння «быційныя» пытанні аказваюцца ў цэнтры ўвагі нацый і народаў, грамадстваў і індывідаў, набываючы глабальны характар. Зараз само існаванне чалавецтва стала вельмі праблематычным, перспективы гэтага існавання залежаць ад змен форм быцця і сабыцця краін і народаў, кожнага чалавека.

Тлумачэнне сэнсу праблем быцця, удакладненне зместу гэтай катэгорыі ёсць прэрагатыва філасофскай навукі. Наша задача - зрабіць мастацкі аналіз трансфармацыі дадзенага паняцця і знайсці магчымасці для адлюстравання «быційных» калізій, абапіраючыся на вопыт літаратуры, у прыватнасці, спраектаваць разгляд адпаведных пытанняў на беларускую «ваенную» аповесць, засяродзіўшы ў дадзеным выпадку ўвагу на творчасці знакамітых класікаў - В. Быкава і І. Навуменкі.

Найперш трэба адзначыць, што пра ваенныя падзеі пісалі ў сусветнай літаратуры многа і шматпланава: як у паэтычным, так і ў эпічным ключы. Галоўнай складанасцю было іх рэальнае, праўдзівае адлюстраванне. Яшчэ з часоў хрушчоўскай «адлігі» ў савецкім друку пачалі выдаваць кнігі заходніх аўтараў (у тым ліку і па дадзенай тэматыцы), якія дагэтуль былі для людзей невядомыя. В. Быкаў у сваёй кнізе «Доўгая дарога дадому» прыгадвае, што асобных «ваенных» твораў некаторых заходніх аўтараў (напрыклад, Рэмарка «На заходнем фронце без пераменаў», Хэмінгуэя «Па кім звоніць звон») улады ўвогуле стрываць не маглі. «Як заўжды, аператыўна было пушчана ў абарот зняважлівае ў нас азначэнне рэмаркізм, які, бы бірку быку на рогі, вешалі на таго ці іншага аўтара. Першай такой «пашанай» быў ганараваны Булат Акуджава з яго невялічнай, апе ёмістай аповесцю «Будзь здароў, шкаляр» ...То была добрая аповесць. Але больш пра вайну Акуджава, здаецца, не пісаў...» [I, с. 277].

Ваеннай тэматыкі не абмінула і беларуская літаратура. У дадзеным напрамку працавалі такія аўтары, як І. Шамякін, К. Чорны, І. Чыгрынаў, Я. Брыль, І. Навуменка, А. Адамовіч, В. Быкаў і іншыя пісьменнікі, асобныя з якіх з'явіліся пачынальнікамі і паспяхова працягнулі развіццё своеасаблівага жанру «ваеннай» аповесці.

Даючы характарыстыку дадзенай з'яве ў беларускай літаратуры, варта адзначыць адно - пры наяўнасці адметнага стылю і асабістых мастацкіх сродкаў перадачы «быційных» момантаў у час ваенных падзей крэда айчынных аўтараў пры асвятленні пытанняў азначанага кшталту можна выразіць словамі таго ж В. Быкава: «Тое, што мы намагаліся і ніяк не маглі зразумець у вайне, знакаміты Хэм зразумеў і напісаў яшчэ ў 30-я гады. 3 таго часу, а можа, і раней, сутнасць вайны не змянілася. Ваенная сутнасць наогул наўрад ці мяняецца праз стагоддзі. Толькі на першы погляд здаецца, што наша вайна не такая, як папярэдняя, у чымсь кожная наступная вайна інакшая, а ў выніку ўсе аднолькавыя. Мінае час, і ўсе зліваюцца ў адно ёмістае і ненавіснае людзям азначэнне - вайна. Хэмінгуэй адкрыта сказаў, што «вайна - тэта бардак...» [1, с. 278].

Творчасць В. Быкава і І. Навуменкі неабходна адносіць да розных стылёвых плыняў беларускай літаратуры. Так, паводле мастацкіх асаблівасцей, творы В. Быкава, побач з творамі І. Мележа, І. Шамякіна. І. Пташнікава, 1. Чыгрынава і іншых, уваходзяць у рэалістычна-анапітычны напрамак беларускай прозы, а творы І. Навуменкі (асабліва пасляваеннай тэматыкі), як і Я. Брыля, М. Стральцова, В. Карамазава і г.д., адносяцца да лірычнай прозы. Адсюль адразу бачны разнапланавы ракурс пры мастацкім асвятленні пісьменнікамі «быційных» падзей увогуле, і, у прыватнасці, праблемы чалавечага быцця.

Пытанне пра быццё - адно з тых, што пакладзены ў аснову сусветнай мастацкай літаратуры, якая пры разглядзе дадзенай праблемы дасягае часам вышэйшай мяжы абагульненасці, абсграгаванасці ад адзінкавага, прыватнага. У той жа час мастацкае разумение быцця блізкае да патаемных глыбінь чалавечага жыцця, да канкрэтных пытанняў, якія чалавек здольны ставіць перад сабой у хвіліны найвялікшага маральнага напружання:

Быць ці зусім не быць -
Вось тут вырашэнне пытання.

«Гэтае выказванне - не варыянт перакладу пачатковых слоў са знакамітага маналога Гамлета, а ўрывак з паэмы "Пра прыроду" старажытнагрэчаскага філосафа Парменіда» [2, с. 3]. Так, яшчэ антычная філасофія і літаратура сфармулявалі шэраг фундаментальных ідэй і праблем, якія не згубілі значэння і да сённяшняга часу. Напрыклад, упершыню ўзнялі праблемы чалавека і яго пазнання; яго адносіны з іншымі людзьмі; пытанні маралі; суаднесенасць чалавека з дзяржавай і палітыкай; сутнасць абсалютнай ісціны; праблемы волі і свабоды чалавека; дасягненне шчасця; адносіны чалавека з Богам і інш.

В. Быкаў, паводле слоў сучаснікаў, у сваёй творчасці з'яўляўся чорным філосафам, песімістам. С. Дубавец паспрабаваў вызначыць прыроду гэтага песімізму наступным чынам: «Кажуць пра песімізм аўтара, але гэта не навіна. Песімізм гэты патрабуе ўвагі... Песімізм - з'ява, якая адыходзіць, і праз прамежак часу яна можа ўспрымацца як фон (ці антураж). Тады застаецца толькі сведчанне пра нашу эпоху і час і пазачасавыя псіхалагічныя сітуацыі» [3, с. 8]. Сапраўды, робячы праекцыю на жанр аповесці І. Навуменкі, можна казаць пра песімістычны пачатак яго твораў пасляваеннай тэматыкі, а згушчэнне фарбаў тут выступае як псіхалагічны фон пры паказе несвабоднага чалавечага існавання ва ўмовах эпохі таталітарызму.

У кожнага з дадзеных аўтараў ёсць свая філасофія ўспрымання ваенных падзей, свае сродкі перадачы праблемы чалавечага быцця. Адпаведна, трэба адзначыць, што для В. Быкава характэрна прытчава-парабалічная перадача рэчаіснасці, а ў І. Навуменкі яна пабудавана па прыёме кантраснасці і падаецца ў канкрэтным асвятленні.

Шэраг сусветных філасофска-культурапагічных палажэнняў часткова знайшлі сваё ўвасабленне ў творчасці аўтараў. Так для «ваеннай» аповесці В. Быкава, на нашу думку, характэрны пэўны касмізм пры адлюстраванні праблем чалавека і яго месца ў Сусвеце. Вышэйшая сутнасць, паводле В. Быкава, - і ёсць Бог, які знаходзіцца за межамі паўсядзённага існавання, адначасова з'яўляючыся адзіным ідэальным сродкам абароны ад суб'ектыўнага фізічнага свету: «Добра, калі пісар паспее перапісаць прозвішчы, а то ідуць (у бой) безыменнымі. І гінуць... У пяхоце не было ніякага ўліку. Во кулямёты ўлічвалі, гарматы, танкі. Нават снарады начальства лічыла, бо за іх адказнасць мела. А за людзей адказваў адзін Гасподзь Бог...» [1, с. 59].

Пісьменнікі-гуманісты асуджалі ўсялякі гвалт над чалавекам, яго свядомасцю і воляй. Славутая ідэя Ф. Ніцшэ пра «звышчалавека» не знайшла шырокай падтрымкі ў свеце, аднак, на вялікі жаль, пусціла свае парасткі. Так Г. Бёль асуджаў і фашызм, і камунізм, прывёўшы цытату з Шэкспіра: «Чума на оба вашых дома». В. Быкаў з гэтай нагоды піша: «Тут Гітлер са Сталіным былі ў адным хаўрусе, хаўрусе вынішчэння. Тое, што недарабіў Сталін у 30-я гады, даканаў Гітлер на пачатку 40-х» [1, с. 422].

Для творчасці аўтараў, у сувязі з адзначанай тэматыкай, характэрны разгляд праблемы выратавання чалавечай душы. У В. Быкава гэтае пытанне вырашаецца праз зварот чалавека да вытокаў, да сутнасці, да Ісціны; у І. Навуменкі - зварот чалавека да свайго ўнутранага Я, да свайго сумлення. У розных выпадках аўтары бачаць адзінае выйсце- чалавек павінен дзейнічаць па законах сумлення, не зважаючы на знешнія абставіны.

Адрознае ў аўтарскім светаўспрыманні праблем быцця чалавека яскрава ілюструюць радкі самога В. Быкава з кнігі «Доўгая дарога дадому»: «Аднойчы ў прыватнай размове за сталом мой аднагодак Іван Навуменка сказаў, гледзячы мне ў вочы: «Я лепшы за цябе пісменнік, толькі ты ўмееш завастраць» [1, с. 222].

У разуменні В. Быкава быццё- гэта тэмпаральная рэальнасць, якая супрацьпастаўлена чалавеку. Нават па назвах некаторых твораў аўтара, не паглыбляючыся ў іх аналіз, відаць адбітак адмоўнага ўплыву суб'ектыўных характарыстык свету - грамадства, ваенных падзей і г.д. - на асобу чалавека (напрыклад, «Пастка», «Аблава», «Сцюжа», «Балота» і інш.). Творчасць жа І. Навуменкі можна назваць няроўнай у творча-выяўленчым плане адлюстравання праблем чалавека. Яскрава ў гэтым ракурсе прасочваюцца два вялікія пласты: ваенная і пасляваенная проза. І. Навуменку называюць прадстаўніком маральна-этычнага напрамку ў сучаснай беларускай прозе, а быццё ў аўтарскім разуменні, на нашу думку, - гэта неад'емная частка чалавечага мікракосмасу, арганічнае ўпляценне ў нізку своеасаблівага «чапавечага кола». Менавіта праз псіхалагічны момант, асабістыя перажыванні лірычнага героя, яго стасункі з іншымі людзьмі І. Навуменка (паводле аўтарскай манеры) раскрывае сутнасць быцця і дае яму своеасаблівую стрымана-завуаляваную характарыстыку. Так, для ваеннай прозы пісьменніка характэрна завострана-ўзнёслае светаадчуванне, пры якім нават каханне падаецца сапраўдным і трывапым.

Для пасляваеннай аповесці І. Навуменкі, як і для творчасці В. Быкава, характэрны своеасаблівы песімістычны пачатак у асвятленні будучага краіны ў цэлым і чалавечага існавання ў прыватнасці. Так, у аповесці «Замяць жаўталісця» (1976) І. Навуменкі ёсць такія радкі: «Дыхаць было цяжка, і ўвогуле расло адчуванне, што ў іх адносінах дасягнута мяжа, ззаду зведанае,...наперадзе - няпэўнасць» [4, с. 9]. Аўтары імкнуцца на фоне татальнага прэвалявання «чалавека натоўпу» падкрэсліць чалавечую індывідуальнасць, фатальнасць і роспачнасць перад адмоўным уплывам быцця - арэнай несапраўднага існавання. Калі І. Навуменка больш мэтазгодным лічыць пазнанне чалавекам ісціны ў працэсе яго рэалізацыі як асобы ў

соцыуме наогул (і на вайне ў прыватнасці), дык В. Быкаў супрацьпастаўляе чалавека і натоўп, выкарыстоўваючы ці жанр прыпавесці (Каін і Авель, Іуда і Хрыстос - аповесць «Сотнікаў»), ці элементы экзістэнцыяльнай філасофіі (выбар у крызіснай, памежнай сітуацыі - «Дажыць да світання», «Мёртвым не баліць», «Круглянскі мост » і інш.).

Творчасць пісьменнікаў (В. Быкава ў большай ступені) мае адбіткі ўплыву асобных напрамкаў заходняй філасофіі. Так, у прыгаданай аповесці «Замяць жаўталісця» аспірант Высоцкі «чытаў Канта, як і астатніх філосафаў, - Арыстоцеля, Гегеля, нават самых навейшых-экзістэнцыялістаў. У моры абстракцыі ён пачаў плаваць даволі лёгка...А Кант- сапраўды адметны філосаф» [5, с. 171]. Лёгка прасачыць сувязь поглядаў самога І. Навуменкі і ўвагу да праблем маральнага кшталту з палажэннямі «катэгарычнага імператыву» І. Канта. В. Быкаў жа ў сваіх успамінах пісаў: «Асабліва ўразіў Сартр сваімі філасофскімі экспромтамі пра экзістэнцыялізм. Разумна ён гаварыў, Сартр, а я думаў, што ўсё ж праўда на баку ягонага земляка Камю, які зганіў СССР за канцлагеры, а Сартр за тое парваў з ім адносіны» [1, с. 242].

І. Навуменка ў сваіх творах, што прысвечаны ваеннай тэматыцы, пераважным лічыць служэнне чалавека на карысць сваёй краіны, іншых людзей; падкрэслівае неабходнасць самаахвярнасці асобы ў імя розных акалічнасцей, што з'яўляюцца сітуацыйна непазбежнымі: «Страхам не запалохаеш. Ёсць людзі, якія свядома ідуць на смерць. Людзі ідэі. Гэта партызаны, падпольшчыкі, наогул, людзі не скораныя духам. Іх многа, многія тысячы» [6, с. 391].

Аднак асобныя радкі твораў трансфармуюць пазіцыю самога аўтара ў дачыненні да пытанняў фізічнага жыцця чалавека, надаючы ім прыярытэтнае значэнне ў апазіцыі гераічнай, самаахвярнай смерці: «Я чытаў раман Рэмарка «На Заходнім фронце без перамен». Яго старонкі дыхаюць пракляццем вайне. Бо і там чалавек пастаўлены перад сцяной перашкод, якія асабіста адолець не можа. Ён сядзіць у акопе і чакае смерці. Гэтае чаканне і ёсць сучаеная вайна» [6, с. 391].

У творчасці В. Быкава першапачаткова назіраецца зварот пераважна да характарыстыкі людзей ваенных. У ранніх аповесцях аўтара таксама можна знайсці адбіткі некаторых палажэнняў «катэгарычнага імператыву» І. Канта, сутнасць якіх зводзілася да наступнага: 1) галоўнай мэтай учынкаў чалавека павінна быць асабістая маральная дасканаласць і шчасце іншых людзей; 2) учынкі чалавека не павінны парушаць свабоду іншых людзей. Такім чынам, выконваючы гэтыя правілы, чалавек можа ацаніць, маральна ці амаральна ён сябе паводзіць.

«Ранні» герой пісьменніка часта выбірае смерць у супрацьлегласць існаванню, якая, паводле аўтарскай задумы, з'яўляецца адзіным выйсцем у пэўнай сітуацыі. Галоўнае крэда героя - не згубіць уласнай годнасці, асабістай маральнасці, не нашкодзіць іншым людзям. Смерць уяўляецца як асабістае збавенне і фізічна-маральнае выратаванне тых, хто побач.

Больш «сталы» Быкаў-пісьменнік усё часцей пачынае задумвацца пра ватрасць і каштоўнасць фізічнага чалавечага жыцця. І. Фіхтэ сцвярджаў, што быццё ствараецца дзейнасцю чалавека і трэба заўсёды «дзейнічаць згодна са сваім прызначэннем» [7, с. 41]. Так, В. Быкаў прыходзіць да высновы, што чалавек павінен быць адказны за тое, каб разумець сваё месца ў свеце, сваё прызначэнне; імкнуцца быць карысным не толькі грамадству, дапамагаць рэалізоўваць не толькі патрэбы свайго народа, нацыі, але ведаць мэту і свайго жыцця. Аўтар піша: «Усё ж такі на вайне жыццё мела ўласную каштоўнасць... Толькі жывы тут мог нешта значыць, мёртвы не значыў нічога. Кажуць, памяць! Але памяць- - пыл на ветры, цень на пяску, а памёр - тваё месца зоймуць другія. Тыя, хто бліжэй апынецца» [8, с. 371].

• Беларуская гісторыя, культура і літаратура прайшлі складаны шлях пошукаў нацыянальнай незалежнасці і самабытнасці. Нацыяналістычныя ідэі ў пэўны час, на жаль, цалкам былі заменены на папулярызацыю ідэй марксізму-ленінізму, ухваленне «поспехаў» на шляху пабудовы сацыялістычнага грамадства, прапаганду ідэй пра росквіт нацый і культур. У літаратуры пераважала абсалютызацыя класавага падыходу, якая паспяхова ўвасаблялася ў метадзе сацыялістычнага рэалізму, што ўхваляў ідэю самаахвярнасці чапавека ў дачыненні да ваенна-палітычных праблем. Малейшыя адхіленні ад зададзеных канонаў жорстка караліся і цкаваліся. Ва ўмовах ідэалагічнага прэсінгу асобным беларускім літаратарам цяжка было працаваць, не пераступіўшы праз сваё сумленне, рэалістычна апавядаць чытачам пра «быційныя» пытанні без фальсіфікацыі фактаў.

Такім чынам, пісьменнік-гуманіст, побач з прыхільнікамі суб'ектыўнага ідэалізму, яшчэ раз падкрэсліў перавагу менавіта чалавечага пачатку сярод іншых падстаў свету.

Падсумоўваючы сказанае, трэба адзначыць наступныя тэндэнцыі, характэрныя для творчасці пісьменнікаў пры адлюстраванні праблем быцця:

1) у агульным плане аўтары з'яўляюцца пашыральнікамі гуманістычнага патэнцыялу беларускай літаратуры (на першым плане - чалавек, яго душа і перажыванні), узятага з лепшых традыцый сусветнага філасофска-мастацкага вопыту;

2) праблема маральнага выбару герояў (аўтары вырашаюць яе па-рознаму), дзе ва ўсялякай сітуацыі чалавек павінен заставацца чалавекам;

3) творчасць пісьменнікаў характарызуецца разумением трагічнага і гераічнага ў літаратуры (маральная ці фізічная смерць герояў амаль заўсёды нясе жыццесцвярджальны пафас);

4) у разумение гераічнага ўносіцца новае - мнагастайнасць подзвігу (канцэнтрацыя ўвагі на сціплыя ўчынкі - у В. Быкава, масштабнасць і ўзнёсласць - у І. Навуменкі);

5) прыярытэтнасць фізічнага жыцця асобы і сцвярджэнне яго каштоўнасці;

6) філасофская насычанасць і перавага маральна-этычнай праблематыкі ў аповесцях аўтараў;

7) рэфлексійнасць герояў (думаюць, разважаюць, пакутуюць) - у В. Быкава яны заўсёды валодаюць тэмпаральнымі характарыстыкамі (за выключэннем пэўнай ідэальнасці прытчава-біблейскіх вобразаў); у І. Навуменкі вобразы характарызуюцца некаторай статычнасцю, для іх характэрна пачуццёвая канкрэтыка.

Такім чынам, новая карціна свету паставіла ў зеніт гісторыі прагрэсу чалавека, зрабіўшы яго цэнтрам дзейнасці грамадства. Але чалавецтва, нягледзячы на вялікі адрэзак часу, што аддзяляе яго ад мінулых ваенных падзей, не павінна на іх забывацца. І гэтаму спрыяе творчасць пісьменнікаў-гуманістаў, галоўная задача якіх - рэалістычна асвятляць мінулыя падзеі ў імя будучыні, у імя фарміравання асноў новага гуманізму: глабальнасці мыслення, любові да справядлівасці, высокай маральнасці, супрацьстаяння гвалту асобы, захавання духоўнай спадчыны і найбольш поўнага развіцця фізічных, інтэлектуальных і сенсітыўных якасцей кожнага канкрэтнага чалавека.

## ЛІТАРАТУРА


1. Быкаў В. Доўгая дарога дадому. - Мн.: ГАБТ «Кніга», 2003. - 539 с.
2. Мотрошилова Н. В. Бытие // Вопросы философии, 1989. - № 4. - С. 3 - 27.
3. Пахаджане. Прыпавесці. Vostraja Brama. - Наша ніва, 1999. - 190 с.
4. Навуменка І. Выбраныя творы ў двух тамах. -Мн., 1995. Т. 1. - 477 с.
5. Навуменка І. Замяць жаўталісця. - Мн., 1977. - 302 с.
6. Навуменка І. Выбраныя творы ў двух тамах. - Мн., 1995. - Т. 2. - 494 с.
7. Философия / под ред. Кохановской Т. И. - Ростов н/Дон: Фенікс, 2001. - 575 с.
8. Быков В. Бедные люди. - М.: Вагриус, 2002. - 460 с. (пераклад аўтарскі - *Т. Б.)*.